№ 9. Панядзелак, 7 лістапада (25 акцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

Хто не заплаціў яшчэ падпісных грошы за кастрычнік, таму газэту высылаць ужо ня будзем, пакуль не заплоціць.

Што чуваць у сьвеце?

Вашынгтонская канфэрэнцыя.

✦ Вашынгтонская канфэрэнцыя пачнецца 12-га лістапада і працягнецца дзён 10.

✦ „Temps“ падае афіцыяльную дэклярацыю і праграму вашынгтонскай канфэрэнцыі аб непарушальнасьці цэласьці Усх. Сыбіру і палітыцы адчыненых дзьвярэй у Верхняй Сьлезіі.

✦ „Temps“ піша: ў канфэрэнцыі аб разбраеньні будуць: Амэрыка, Англія, Францыя, Італія і Японія.

✦ Разам з Брыянам на Вашынгтонскую канфэрэнцыю выехаў і маршал Фош; ён быў прыняты ўрачыста прэзыдэнтам Гардынгам. Фош заявіўся й да Вільсона, але быўшы прэзыдэнт ня прыняў яго.

✦ У Парыж прыбыла італьянская дэлегацыя на вашынгтонскую канфэрэнцыю.

Вялікабрытанія.

✦ „Daily Chronicle“ паведамляе аб заяве Лёйд-Джорджа ў ангельскім парлямэнце, што варункам англа-ірляндзкае згоды зьяўляецца прызнаньне сувэрэннасьці караля.

✦ Ангельскае міністэрства заграні чных спраў атрымала ноту Чычэрына аб прызнаньні расейскіх перадваенных даўгоў.

Францыя.

✦ У Парыжы пачаўся зьезд французскіх соцыялістаў.

✦ Францыя атрымала ноту Чычэрына аб прызнаньні даўгоў.

Нямеччына.

✦ У паседжаньні нямецкага рэйхстагу абвешчаны склад новага кабінэту. Вірт — прэм'ерам і міністрам заграні чных справаў.

✦ За вотум веры Вірту падана ў рэйхстагу 230 галасоў, проці 122.

✦ Нямецкі канцлер Вірт заявіў журналістам, што галоўнаю задачаю новага кабінэту зьяўляюцца гаспадарчыя перагаворы з Польшчаю. Канцлер выказаў надзею, што перагаворы з палякамі прыдуць да спагаднага рэзультату, бо абедзьве староны ўжо выказалі згоду прыняць бяз зьменаў жэнэўскую пастанову.

✦ У Мюнхэне (Баварыя) зроблены напад на пасла рэйхстагу с.-д. Аўэра. Той, хто страляў, ня трапіў; яму ўдалося зьнікнуць.

✦ Нямецкім урадам для перагавораў з палякамі назначаны быўшы міністар справядлівасьці Шыфэр.

✦ Бэрлінскія друкарнічыкі атрымалі дадаткі. Забастоўка скончана.

✦ Правыя нямецкія газэты нападаюць на канцлера й яго падатлівую палітыку ў адносінах да Францыі.

✦ Нямецкі міністар Сіманс заявіў, што Англія паднімае пытаньне аб рэвізіі нямецкіх забавязаньняў у зьвязку з рашэньнем аб В. Сьлезіі.

✦ „Temps“ зьвяртае ўвагу на замер Нямеччыны выкарыстаць арт. 234 вэрсальскага дагавору дзеля атрыманьня льготаў па выплаце кантрыбуцыі.

✦ Ген. Нолет патрэбаваў зьнішчыць у нямецкіх гарадох Кіле, Эрфурце, Шпандау заводы, што выробляюць вайсковыя прылады, падводныя чаўны і зброю.

Угоршчына (Вэнгрыя).

Паводлуг апошніх вестак, у Вэнгрыі спакойна. Войскі Мал. Антанты нідзе ня ступілі на вэнгерскую тэрыторыю, хаця стаяць зусім напагатове.

✦ Газэты пішуць, што вэнгерскі ўрад патрэбаваў ад Карлы Габсбурга адмовы ад пасаду, згодна з трэбаваньнем дзяржаў коаліцыі.

✦ Кароль Габсбург заявіў вэнгерскаму ўраду, што ён лічыць за лепшае быць павешаным, ніж адмовіцца ад трону.

✦ Польск. Тэлегр. Аг. паведамляе з Лёндану, што Рада Паслоў выбрала востраў Мадэйру, як месца пабыту Карлы Габсбурга.

✦ З прычыны адмовы Карлы зрачыся трону, дзяржавы паведамілі Малую Антанту, што яны ня будуць працівіцца яе рыхтаваньням, калі адрачэньне будзе адкладзена.

Польшча.

✦ Тайная паліцыя ізноў раскрыла ў Варшаве камуністычны загавор. Арыштована 20 чалавек, захоплена шмат бомбаў.

✦ Маючы на ўвазе барацьбу з дарагоўляй, польскі прэм'ер Панікоўскі запрасіў да сябе 20 прадстаўнікоў ад купцоў, падкрэсьліўшы ненармальнасьць таго, што ня гледзячы на падвышэньне курсу польскай маркі цэны на прадукты ўсё-ж такі падрастаюць.

✦ „Polpres“ паведамляе з пэўных крыніцаў, што віцэ-міністар Польшчы па заграні чных справах Домбскі падаецца ў адстаўку.

✦ На рабочым мітынгу ў Пазнані прынята рэзалюцыя камуністаў адмовіцца ад работы ў той тэрмін, які вызначаны мястоваю радаю.

✦ Пасол Польшчы ў Маскве вярнуўся ў Варшаву.

✦ Заграні чная прэса ад'значае, што жэнэўскае рашэньне зрабіла моцны ўплыў на ўдачу польскае заграні чнае пазычкі, якая будзе рэалізавана ў Бэльгіі.

✦ Есьць газэтныя весткі, што ангельскі парлямэнт пастанавіў адкрыць Польшчы крэдыт у 2 мільёны фунтаў штэрлінгаў; гэткі самы крэдыт адкрыты й Аўстрыі.

✦ Польскі ўрад паслаў савецкаму ўраду ноту, пратэстуючы проці абвінавачаньняў Польшчы ў дачыненьні яе да паўстаньня ў Камянец-Падольску і на р. Збручы.

✦ 28 кастрычніка ў Прагу Чэскую выехалі выселеныя з Польшчы расейцы: Віктар Савінков, Дэрэнталь, Рудін і Мягков. Барыс Савінков застаецца ў Варшаве яшчэ пару дзён.

Савецкая Расея.

✦ 29 катыстрычніка ў савецкай прэсе зьявілася паведамленьне ўраду аб прызнаньні перадваенных даўгоў. Бальшавікі трэбуюць афіцыяльнага прызнаньня савецкага ўраду зах.-эўропэйскімі дзяржавамі, прызнаньня незачэпнасьці граніц і дзяржаўнай сувэрэннасьці Расеі. Дэклярацыя выказваецца таксама за склі каньне міжнароднай канфэрэнцыі дзеля разгляду прэтэнсіяў розных дзяржаў да расейскага ўраду й наадварот. Савецкі ўрад выказваецца за аднаўленьне вольнага гандлю і прыватнае ўласнасьці.

✦ Чычэрын выслаў ноту ангельскаму гандлёваму агенту ў Маскве, пратэстуючы проці паддзержкі Англіяй контр-рэвалюцыйнага руху на Далёк. Усходзе. Ад Румыніі Чычэрын трэбуе выдачы Махно.

✦ Красін прыслаў Кэрзону ноту пратэсту з прычыны адсылкі 600 быўшых жаўнераў-дэнікінцаў у Валадзівасток і трэбуе, каб з гэтых жаўнераў было ўзята слова, што яны ня будуць выступаць проці бальшавікоў.

Верхняя Сьлезія.

✦ „Rzeczposp.“ піша, што ў эканамічных польска-нямецкіх перагаворах перш за ўсё будзе разглядацца валютнае пытаньне. Польскі ўрад трымаецца таго пагляду, што абавязкам Нямеччыны будзе дастаўка валюты для усяго сьлескага раёну.

✦ Польская камісія па прынятку верхнясьлезкіх абшараў пачала працу пад старшынствам Альшэўскага.

✦ Газэты паведамляюць, што Рада Паслоў назначыла срок выпаўненьня жэнэўскай пастановы аб Верхн. Сьлезіі—31 сьнежня.

✦ Як паведамляюць з Бэрліну, нямецкія упаважненыя для перагавораў з Польшчаю д-р Шыфэр і Левальд выяжджаюць у Сьлезію ў пачатку тыдня. Перагаворы будуць весьціся ў Ополе ці ў Катовіцах пад старшынствам праф. Годака, чэскага экспэрта Лігі Народаў.

Румынія.

✦ Ангельскія фінансісты запрапанавалі Румыніі кароткасрочную пазычку на 3 гады ў разьмеры 5.000.000 фунтаў штэрлінгаў.

✦ У зьвязку з пярэрваю ў Варшаве румынска-савецкіх перагавораў, часьць румынскай дэлегацыі ўжо выехала ў Букарэшт.

✦ Паведамляюць з Белграду, што Румынія мабілізавала 6 дывізіяў пяхоты і 2 дывізіі кавалерыі.

Сярэдняя Літва.

✦ Аг. „Е. Е.“ паведамляе, што ў варшаўскіх палітычных сфэрах пануе пераканаьне, быццам ген. Жэлігоўскі пакіне Вільню перад склі каньнем у ём Сойму.

Украіна.

✦ Атаман украінскіх паўстанцаў Забалотны прарваўся праз акружыўшыя яго чырвоныя войскі і ўцёк у Румынію.

Латвія.

✦ Латвійскі прэм'ер Меервіч у гутарцы з карэсп. „Руспрэс“ заявіў: нашыя адносіны з Эстоніяй, разьвіваючыся, прымаюць форму канкрэтных зблі жэньняў. З Літвою нас злучае ўзаемнае братэрства і глыбокая сымпатыя, таксама як і супольнасьць інтарэсаў.

Палітыка.

„Kurjer Poranny“ (287) зьмесьціў такое пісьмо Старшыні Беларускага Камітэту ў Варшаве п. Л. Дубяйкоўскага:

„Пакуль што стрымліваючыся ад падробнай справаздачы аб нарадах Беларускай Палітычнай Канфэрэнцыі, якая адбылася ў Празе 26.IX-30.IX улучаючы 1921 г., гэтым я толькі выяўляю чараду сумысьля-лгарскіх вестак, якія могуць быць толькі прыкладамі фальшывых даносаў, пашыраных у польскай прэсе п. Аляксюком, які, між іншым кажучы, спазьніўся, і два першых дні зьезду яго ня было ў Празе.

Адгукаючыся на артыкул, выдрукаваны пад тытулам „Echa białoruskiego zjazdu w Pradze“ ў „Gazecie Warszawskiej“ за 15.X.1921 г. на падставе паведамленьняў п. Аляксюка, сьцьвярджаю, што:

1) Няпраўда, што зьезд меў характар выразна супроць-польскі,—бо аднагалосна прынятая рэзалюцыя пратэсту супроць падзелу Беларусі на моцы рыскага трактату у роўнай меры скіравана супроць Расеі, як і Польшчы.

2) Няпраўда, што „за супроць-польскія рэзалюцыі галасавала т. зв. група Дубяйкоўскага“. На зьезд у Празе удалося дастацца толькі мне самому. Дзякуючы перашкодам палітычнай натуры, з забору польскага і расейскага на зьезд у Празе прасмыгнула толькі некулькі прадстаўнікоў. Гэта адбілася на выніку галасаваньня, дзе непараўнаную большасьць мелі эмігранты з Ковенскай Літвы і Нямеччыны, прыхільнікі ураду Ластоўскага, ня надта прыхільна глядзячыя на Польшчу.

Што датычыць маей палітычнай арыентацыі, дык яна вядома паўсюдах у Польшчы і на Беларусі і пацьверджана шматгодняю барацьбою проці расейскага царызму.

3) Няпраўда, што ў „спрэчках прарываліся бальшавіцкія ноткі“. Такім лгарскім спосабам рабіў даносы п. Аляксюк падчас леташняга бальшавіцкага надходу, што ўсе беларускія дзеячы (пэўна-ж, апрача самога п. Аляксюка) як заўсёдныя жыхары Варшавы, так і тыя, якія хаваліся ў Варшаве перад бальшавіцкаю навалай, — адны бальшавікі; гэты данос пацягнуў за сабою чараду прыкрых, а зусім непатрэбных, як потым выявілася, уціскаў супроць беларусаў (ночныя рэвізіі і інш.).

4) Няпраўда, што прадстаўнік украінскай моладзі, каторая вучыцца ў Празе, „выказаў, нібы львоўскі напад быў справаю украінскай народнай моладзі“; аб сумнай справе львоўскага нападу на Беларускай палітычнай Канфэрэнцыі ня было ніякай гутаркі“.

Украінскае жыцьце.

❋ Французская газэта „L' Ère Nouvelle“ піша: „Польскія ўлады ў Усходняй Галіцыі, жадаючы паставіць Антанту перад зробленай справай, распачалі ўва ўсёй староны перапісь, у якой між іншым, адзначаецца палітычная прыналежнасьць. Тыя ўлады прымушаюць жыхароў запісывацца грамадзянамі польскай рэспублікі. Дзеля супраціўку украінскага насяленьня, скрозь адбываюцца масавыя арыштаваньні пры помачы высланага войска“.

❋ Львоўская ўкраінская газэта „Вперед!“ у кожным нумары зьмяшчаець цэлыя шпальты аб арыштах і грашавых карах у Галіцыі польскаю ўладаю украінскіх дзеячаў, вучыцялёў, духаўнікоў, кааператараў і сялян цэлых вёсак за тое, што ў часе перапісі яны кажуць: „Не прызнаюся да польскага грамадзянства. Я грамадзянін Усходняй Галіцыі“—і не падпісуюць перапісных лістоў.

❋ Украінскае Педагагічнае Таварыства выслала тысячы адозваў да ўкраінцаў у Амерыцы, каб складывалі грошы на ўкраінскія прыватныя школы. Як кажа ўспомненая адозва, гэта ўстанова утрымлівае на свой кошт у гэтым школьным годзе: ў самым Львове 9 школ з асьветай у спэцыяльным кірунку, столькі-ж і пачатковых. Вучыцца ў іх каля 2000 дзяцей пад кіраўніцтвам 61 вучыцеля. На правінцыі пад апекай або на ўтрыманьні Таварыства знаходзіцца 5 сярэдніх украінскіх школ, 10 курсаў гімназіяльных і 5 сэмінарыяў. У гэтыя школы ходзіць 3190 вучняў, а выкладае там 267 вучыцялёў. Буджэт Украінскага Педагагічнага Таварыства паказывае на 2 міліёны месячных расходаў. Украінскае Педагагічнае Таварыства спадзяецца атрымаць з прычыны свайго 40 гадовага іетнаваньня ад амарыканскіх украінцаў вялікія грошы.

Літоўскае жыцьце.

❋ „Przegląd Wileński“ піша: „Можна было баяцца, што рэпрэсіі, з якімі ў астатнія часы адносіцца сярэдня-літоўская ўлада да ліцьвіноў у Вільні (дзіўна гучыць гэткі склад словаў — ці ня праўда?) вызаве адказ палякоў у Коўні. Сталасяж, аднак, інакшай. Маю перад сабой чараду пастаноў, прынятых на розных мітынгах, зьездах і зборках у Коўні ў зьвязку з выдаленьнем гімназіі і прытулку з урадовых будынкаў, разам з зачыненьнем чарады літоўскіх інстытуцый у Вільні.

У войстрых выразах кляймяць яны, разумеецца, паступкі віленскай улады, але выразна засьцярагаюць проціў адказнай тактыкі, роўна, як і літоўская прэса заклікаець да памяркоўнасьці і развагі.“

❋ У Вільні з 29 кастрычніка выходзіць новая штодзенная газэта на літоўскай мове „Vilnietis“.

❋ У Коўні пачаліся заняткі ў Дзяржаўным Літоўскім Унівэрсытэце.

❋ На паседжаньні Жыдоўскай Нацыянальнай Рады ў Коўні старшыня яе д-р С. Розэнбаум сказаў, што літоўскія жыды моцна зацікаўлены ў далучэньні да Незалежнае Літвы яе сталіцы Вільні, гэтага вялікага жыдоўскага асяродка.

❋ Міністар унутраных спраў Літвы паслаў свайго прадстаўніка ў Маскву з мэтаю зрабіць парадак з паваротам уцекачоў з Савецкай Расеі ў Літву.

Пералом у бальшавіцкай палітыцы.

Газэты перадалі вельмі цікавую вестку, што ў савецкай прэсе надрукована дэклярацыя Расейскага Савецкага Ураду аб тым, што Савецкі Урад—

1. прызнае даваенныя даўгі Расеі,

2. вымагае афіцыяльнага прызнаньня недатыкальнасьці граніц і дзяржаўнай сувэрэннасьці Расеі,

3. выказваецца за вольны гандаль і прыватную ўласнасьць.

Прачытаўшы гэты пункты, асабліва-ж п. п. 1 і 3, прыходзіцца згадзіцца з тым, што Саветы у корані парвалі з папярэдняй сваёй гаспадарча—эканамічнай сыстэмай, афіцыяльна прызнаўшы банкруцтва „расейскага камунізма“ ў сучасны момант і пры сучасных варунках.

„Вольны гандаль“.. „Прыватная уласнаць“. Гэта-ж страшэнныя словы, якія ужо тры гады—як былі забаронены ў Савецкай Расеі. „Вольных“ гандляроў і „прыватных“ ўласьнікаў саветы стараліся вынішчыць пры помачы тысяч дэкрэтаў і „чрэзвычаек.“ Сколькі энэргіі, сколькі часу, сколькі грошаў пайшло на гэнае зьнішчэньне? Сколькі нязьметных багацьцяў, прадпрыемстваў, фірмаў загінула?

Усё гэта аказалася непатрэбным; мала таго —вельмі і вельмі шкодным для самых саветаў, не гаворачы ўжо аб Расеі. Бо чым, як ня прызнаньнем шкоднасьці папярэдняй сваей палітыкі можна растлумачыць неспадзяваны круты зварот саветаў ў бок вольнага гандлю і прыватнай ўласнасьці,—гэтых падвалін не-камуністычнага устрою.

Пасьля вышэйпамяненай дэклярацыі усякаму не выключаючы і камуністаў, ясна, што спробы насадзіць камуну папяровымі дэкрэтамі ня можна.

Жыцьцё бярэ сваё... і ўсясільны Ленін капітуліруе перад... дробным буржуем і перад сусьветным капіталам, г. ё. перад тым, каго ён так ненавідзеў і проціў каторага так моцна ваяваў аж тры гады.

Саветы будуць выплачываць даваенныя пазычкі царскага ураду. Да сягоньняшняга дню бальшавікі казалі, што плаціць на абавязках, ня імі гарантаваных, яны ня будуць. Цяпер-жа яны заяўляюць, што да-ваенныя пазычкі яны гатовы выплаціць. А пазычкі пад-час вайны? Відаць, што іх выплачываць бальшавікі ня зьбіраюцца. Трэба прызнаць, што іх пазыцыі маюць нейкую слушнасьць. Саветы ня хочуць плаціць па абавязках сусьветнай вайны, якая скончылася бяз іх учасьця і,—што вельмі важна, і ня толькі для Саветаў, а навет для Расеі,—без Расеі.

Тут найлепшы юрыст, найлепшы дыплёмат, найлепшы мораліст,—усе разам узятыя зубы зломяць і ня змогуць даказаць, што Расея павінна плаціць ваенныя пазычкі, а ня можа карыстацца ніякімі выгадамі пераможцаў. Адсюль і вывад расейскіх бальшавікоў. Раз вайна кончылася бяз нас і пераможцы падзялілі ўсё бяз нас, то і абавязкі па вайне няхай нясуць усе—хто хоча—бяз нас!

Довад зусім слушны,

Гарантыі граніц!

Мы разумеем сэнс гэтага пункту. Суверэн на аснове дагавору паміж быўшымі сваімі падўладнымі і сабою хоча астацца недатыкальным ні з чыйго боку.

Так сама, — з фармальнага боку, -правільна Але тут паўстае пытаньне аб справядлівасьці, аб ў адносінах да падзеляных бальшавікамі і дагаворнікамі чужых тэрыторыяў, напр.: беларускіх Мы, беларусы, так накрыўджаныя гэтымі дагаворамі, падзяліўшымі нас на кавалкі, пратэстуем проціў падобнага прызнаньня, бо толькі мы самы за сябе можам гаварыць.

Але, ці паслухаюць нас, ці—запытаюць нас

аб нас-жа? Канчаючы кароткі разбор дэклярацыі Саветаў, мы змушаны яшчэ раз асабліва падкрэсьліць, што бальшавіцкая палітыка зрабіла круты зварот ад непрымірымага камунізма ў бок прыстасаваньня да сучаснага агульна-чалавечага жыцьця.

Пачакаем, убачым...

Магчыма, што „курс“ дасьць добрыя рэзультаты для галоднай Расеі, а так сама адаб'ецца і на ўзаема-адносінах саветаў з усім сьветам.

М. К.

Слуцкае паўстаньне.

Год таму назад было Слуцкае паўстаньне.

Як толькі палякі занялі Слуцак і сталі за ім вёрст за 10, амаль ня ўсе случакі кінулі чырвоную армію і прышлі дамоў. К таму часу было зроблена замірэньне. Стала ведама, што Слуцкі павет павінен адайці к маскоўцам.

Пайшла моцная агітацыя сярод беларусаў, каб сарганізавацца і ня пусціць к сабе маскоўцаў. Гэтая агітацня мела ўспех. бо чырвоная армія дзеля Случчыны была фараонаваю кароваю, каторая аб'ядала да пасьледняга, толькі-б самой быць жырнаю. А пераход з рук аднаго войска да другога палохаў сялян яшчэ больш: ня так даўно патухлі пажары вёсак, падпаленых адхадзіўшымі пад Варшаву палякамі...

Салдаты былі дома і толькі чакалі добрых арганізатараў. К таму часу пасьпела і Рада Случчыны, якая была абрана на з'езьдзе ў Слуцку прадстаўнікамі ад валасьцей і самаго горада ў прысутнасьці двух ахвіцэраў ад 11 дывізіі польскае пяхоты.

Рада пачала працу — стала шукаць каго-сь. хто сказаў-бы, што рабіць. Частка сяброў Рады казала, што гэты нехта жывець у Варшаве; другія казалі, што ён жывець не ў Варшаве, а ў штабе „бацькі“ Балаховіча. Нарэшце адправілі паслоў у Варшаву, не пакрыўдзілі і „бацьку“ Балаховіча. Калі паслы вярнуліся, рада абвесьціла, што ўсё ў поўным парадку. К таму часу палякі пачалі адхадзіць на заход ад Слуцка на лінію, аб якой яны угаварыліся з маскоўцамі ў Рызе.

Рада са сваімі салдатамі, адышла сьледам за палякамі і стала ў мясьцечку Семежаве.

Падышлі маскоўцы. Тыя паўстанцы, каторыя разьлічалі на скоры і лёгкі канец, павесілі насы. Тагды-ж пралілася першая кроў беларускага паўстанца за незалежную Беларусь...

Прышла зіма, насталі маразы. Паўстанцы перашлі на новае мейсца, яшчэ далей на заход. Ужо не хапала хлеба. Паявіўся тыфус. Рада пачала адграбаць свае правы ад правоў „вярхоўнага глаўнакамандаваньня“. „Глаўнакамандаваньне“ пачало перабегаць да маскоўцаў. Салдаты галадавалі.

Замест хлеба і вопраткі, скора дайшла вестка, што добрая багіня знайшлася. Каб пацешыць галодных салдат, яна прыслала да іх сваіх сынкоў. Сынкі мелі досыць зьвездак і навет раменчыкі на плячох. Толькі нямногія з іх даехалі да 1-ае Слуцкае брыгады — больш уцякло з дарогі.

Брыгада стаяла ў нейтральным пасе, які знаходзіўся пад пратэктаратам палякоў

Пастанавілі пайсьці на маскоўцаў і забраць Семежава і Вызну. Амаль ня голымі рукамі, босыя, галодныя кінуліс беларусы на маскоўцаў. У траскучы мароз, прайшоўшы каля 20 вёрст па глыбокаму сьнегу, паўстанцы выбілі маскоўцаў і забралі Семежава і Вызну. Ізноў на родных палёх палілася беларуская кроў...

А апошніх сынкоў ужо было ня відаць, — шчасна дэзэртыравалі!

Не на шчасьце пайшоў гэты ўсьпех брыгадзе. Праз тры дні маскоўцы сьцягнулі вялізарныя сілы, як стала сьвятаць, 21 сьнежня аблажылі Семежава і пачалі паліваць з кулямётаў 1-шы Слуцкі полк, які выйшаў на іх.

Сілы былі надта няроўныя. Многа крыві пралілося на вуліцах Новага Семежава. Біліся паміж хлявоў і хат. Біліся са злосьцю, біліся да астатку, бо ведалі, што ад гэтага бою залежыць будучыня.

К таму часу маскоўцы зайшлі ўжо з трох бакоў. Полк пачаў адхадзіць пад бесьперастанным агнём ворага.

Ішлі, каб адыйці ад маскоўцаў; ішлі як пасьля пажара, які зьеў усе будынкі і ўсю маемасьць да астатняе ніткі. Падыйшлі к граніцы. На другі дзень палякі зрабілі ласку і дазволілі перайці яе.

Палонныя, якіх узялі бальшавікі, былі блізка што голыя зімою загнаны ў Слуцкую турму, гдзе перамёрлі ад тыфу.

На граніцы палякі адабралі ў паўстанцаў броню і праз некулькі тыдняў завязьлі іх у Беластоцкі канцэнтрацыйны лагер.

Памыліцца той, хто падумае, што ў гэты лагер папалі і тыя сынкі, што прымазаліся да брыгады па сваім старым прывычкам „дабравольцаў.“ Яны у свой час пасьпелі кінуць салдата так жа скора, як і знайшлі яго. Яны паехалі да Варшавы, Лодзі, свайго бацькі Балаховіча, каб пашукаць, ці ня знойдзецца яшчэ падобнае здарэньне.

У брыгадзе іх работа была ўжо кончана, але кончана такім дзелам, перад каторым памеркла усё — гэта, як потым казалі сьвядомыя людзі, была работа — засадзіць няшчасных салдат у Беластоцкі лагер, які перавышае турму.

Нямала паабівалі яны варшаўскіх парогаў, пакуль дабіліся гэтага. Але ці атрымалі свае срэбранікі — ня ведаю. Яшчэ цікава, каму яны памшчаліся: таму, хто не хацеў дзяліцца з імі валадарствам, ці таму беднаму салдату, нічога перад імі непавіннаму, які доўгія месяцы халоднае зімы, галодны і голы прасядзеў за дротам,

Але настаў час, і салдаты выйшлі з лагера. Босыя, абарваныя, — але радасьць і сьлёзы разам былі відны на твары ў кожнага. Большая частка не хацелі ждаць цягніка: за паўгода яны адвыклі верыць чужынцам і баяліся, каб як-небудзь ня трапіць ізноў за дрот. Кучкамі па 5-6 чалавек яны пайшлі к граніцы — бліжэй к сваім родным хатам.

Цяпер ім шляхі ў родную вёску былі заказаны; там іх чакалі маскоўцы, якія за паўстаньне растрэлівалі.

Паўстаньне зрабіла сваю работу: яно паказала, што народ беларускі аружна паўстае за незалежнасьць.

Вільня, Лістапад, 1921 г. Ан.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

М. **Верцялішкі** Горадзенскага павету.

Два тыдні таму назад згарэла будоўля тутэйшага заможнага гаспадара і вядомага ў нас сталяра Міколы Талочкі. Пажар здарыўся, калі ўсе былі на полі, канчаючы васеньнія работы. Прычынай яго была іскра з цягніка, якая мусіць упала на страху. Згарэлі начыста два дамы, гумно са збожжам, іншыя будынкі гаспадарскія; шмат рачэй... Страты страшэнныя. Бяда гаспадара тым большая, што няшчасьце здарылася цяпер, на восені, калі чалавек сабраў усё з поля, лугоў ды гарода і калі ня час пачынаць адбудову.

Нам здаецца, што Мікола Талочка павінен зараз-жа зьвярнуцца да каляёвага ўраду, каб яму зьвярнулі страту, бо каб кожны цягнік меў на трубе драцяную шапку, дык ня было-б тады магчымасьці іскрам вылятаць адтуль на сялянскія стрэхі. Мусіць быў у той няшчасны дзень цягнік без такой шапкі або яна была дзіравая.

Вельмі спагадаем нашаму сябру ў яго бядзе і маем надзею, што на вясну паставіць ён сабе пякнейшую хату і будынкі.

Вер—скі.

В. **Семяноўка** Крынскай гміны, Горадзенскай губ. і павету.

У вёсцы Семяноўцы істнавала беларуская пачатковая школа з 1917 году з беларускім вучыцелем. Яна была адкрыта яшчэ пры немцах па жаданьні жыхароў. У 1919 годзе былі беларускія вучыцельскія курсы у Вільні, куды быў паехаўшы вучыцель гэтай школы. У часе беларускіх вучыцельскіх курсаў у Вільні, палякі, карыстаючыся адсутнасьцю беларускага вучыцеля, вывезьлі школьныя лаўкі і другія школьныя рэчы, а калі ўжо вярнуўся вучыцель з курсаў, дык і яму не дазволілі больш вучыць. Аж у 1921 годзе ўжо, ў сакавіку месяцы, выклапатаў дазвол у павятовага інспэктара на адкрыцьце беларускай школы ў гэтай вёсцы другі беларускі вучыцель, але школа была і зноў закрыта.

Цяпер-жа ў восень 1921 году 24 жніўня прыслаў павятовы інспэктар польскую вучыцельку, з якой разам прыехала два жандары і зараз-жа ўзяліся за працу. Сабраўшы людзей з усей вёскі, перад імі высказалі іхнія жаданьні, а людзям не дазволілі ані пікнуць.

Гаварылі шмат чаго, прыракалі шмат чаго. Гаварылі, што адкрыўшы польскую школу шмат лепей будзе жыць, бо вывучыўшы польскую мову можна будзе і службу сабе знайсьці. Урэшце палякі адкрылі польскую школу на проці жаданьня жыхароў.

М. **Лаварышкі** Віленскага павету.

У нас сёлета саракгадзіннае набажэнства адбылося вельмі ўрачыста, ксяндзоў наехала шмат з суседніх парахвіяў, каторыя добра працавалі ў спавядніцах, спавядаючы людзей, казаньні так сама гаварылі нішто, але толькі папольску, бо трэба прыпомніць, што прошлым годам нашыя разумнейшыя парахвіяне станоўча намушалі кс. пробашча Семашкевіча, каб было сказана казаньне і ў роднай беларускай мове. Дзеля чаго было напісана прашэньне да біскупа з некалькі сот подпісамі, але біскуп нешта аб нас беларусах забыўся, бо не загадаў пробашчу... а мо, чат, забараніў, Бог яго ведае.

Але мы усёж ня думаем цішком злажыўшы рукі сядзець, мы будзем слаць прашэньне за прашэньнем, дэлегацыю за дэлегацыяй, а свайго даб'ёмся, даб'ёмся права для сваей роднай мовы і ў касьцеле, і ў школе і усюды, дзе толькі жывець наш сярмяжны беларускі народ.

Нашая родная простая мужыцкая мова мусіць стаяць нараўне з польскай, бо яна нам такая самая добрая і харошая і над жыцьцё даражэйшая.

Трэба адзначыць дзікасьць і цемнату нашай Лаварыскай моладзі, каторая ні нашто не зважаючы прапівае апошнюю марку замест таго, каб яе павярнуць на добрую кніжку ці газэту.

Падарожны.

В. **Семяноўка** Горадзенскай губ. і павету.

Дарагія браточкі, хачу праз газэту запытацца ўсіх чытачоў, а так сама усіх тых, хто больш менш знакомы з цяперашняю палітыкаю.

Дзеецца ўсё гэта у нашай вёсцы; можа гэта толькі таму што мы усе праваслаўныя беларусы, і калі палякі рабілі статыстыку, дык мы ўсе пісаліся так: мова—беларуская, нарадовасьць—беларус прыналежнасьць да панства—Беларусь.

Прыехаў нейкі чалавек у нашую вёску: сьперша у маёнтку пры нашай вёсцы зрабіў парадак: каб парабкам пан падвышыў плату і плаціў не грашыма, а хлебам; каб парабкі менш працавалі, а у нядзелі і сьвяточныя дні былі ад усялякіх работаў панскіх свабоднымі.

Здаецца, зусім добры чалавек. З сялянамі гаворыць пабеларуску. Але калі у вёсцы згукаў грамаду і пачаў гаварыць, дык мы думалі, што сьвет дагары нагамі перакуліўся. З якоюсьці раменнаю торбаю, з якое выцягнуў паперыну, і загадаў запісавацца да Польшчы. Калі сяляне не згадзіліся пісацца да Польшчы, дык ён сказаў, што недастануць зямлі, але каб направіць сваю памылку, даў сроку да дваццатага. Няхай ждзе дваццатага! І яшчэ гаварыў, калі запішацеся, дык калі ў каго двох, трох братоў, адзін застанецца на сваей гаспадарцы, а другія пойдуць на панскую землю і ім будуць даны усе гаспадарскія прыналежнасьці. Але мы не згаджаемся і цьвердзімо сваё. Хоць у нас і нашую школку закрылі, а адкрылі польскую, ім яшчэ і гэтага мала!

Селянін.

Страшная музыкава песьня.

Дзеялася тое за прыгонам.

Быў у нашаг пана, акрутнага і злога пана Дастаеўскага, малады музыка.

Звалі яго—Арцём Скамарох.

Затое—Скамарох, што ўвесь род іх—Скамарохі. Бацька, дзед і прадзед умелі йграць на скрыпцы і былі скамарохамі для ўсяе акругі.

Ніводнае вясельле бяз іх не абыйшлося.

Спачатку дзед іграў, даючы прыклады сыну. Потым бацька замяніў, водзячы з сабою па йгрышчах і кірмашах, дзе трэба і ня трэба, свайго малога Арцёмку.

Але, вось, памёр дзед, памёр і бацька з маткаю. Застаўся дзяцюк адзін, сірота. Тады пан Дастаеўскі азяў яго да сябе ў двор.

Іграць-жа хлопец умеў так, што бацьку й дзеда перайшоў. Ня простыя дастаў ад Бога пальцы.

Ды толькі меў і свае гонары Арцём. Вядома, наш брат-мужык, панскі падданы, а ў ім гонар быў зусім нянаскі.

Такі ганарлівы быў хлапец, што навет пан сьцярогся рабіць яму якую крыўду. Такі ганарлівы: як не захоча йграць, то ці ўпрашай яго, ці пагражай яму,—ня стане йграць ды й годзе!

І вось аднойчы прывёз пан Дастаеўскі з Аршавы новую палюбоўніцу-палячку.

Палячка тая вазьмі ды й улюбіся ў нашага музыку.

Узяла на вока простага дзяцюка.

Каб ня быў такі ганарлівы, то рэч у той мінулы час звычайная. Пан бавіцца з палюбоўніцай, а палюбоўніца яшчэ каго у сэрцы мае.

Аж тут выйшла цэлая гісторыя. Арцём дзяцюк быў гэткі: як ня любіў, то й прыкідацца не хацеў...

Выедзе пан Дастаеўскі да Аршавы, або ў госьці да суседзяў, або на ловы ў пушчу,—палячка толькі таго й чакае. Гукнець мальца да сябе і просіць, каб ёй іграў.

Пакуль Арцём ня ведаў, у чым справа, іграў палячцы розныя наскія песьні, да якіх мела яна вялікую цікавасьць, бо ніколі раней ня чула іх. Навет гаманіць панашску трохі нялася, каб знацца, лягчэй апанаваць яго.

Але як зразумеў музыка, што ня простым вокам глядзіць на яго панская палюбоўніца, што наўмысьля распушчаець перад ім свае даўжэнныя, чарнюсенькія, быццам вугальле, косы, што не здарма хмурыць свае бровы, што не здарма ў ле на бел-румяным твары якое-сь нецярплівае, капрыснае ламаньне, як заўважыў усё гэта, — страціў ахвоту іграць ёй песьні.

А дзяўчына відзіць, што хлопец ганарлівы, —і пеўнасьць страціла сваю.

Вядома, як жанчына страціць пеўнасьць, то робіцца як-бы якая няпрытомная. То плача, то сьмяецца, то злуе-халярue, нічога ў сьвеце ёй тады ўжо не смакуе, і кожны лёгка заўважыць яе каханьне.

Палячка была з людзьмі абыходлівая, і шмат хто шкадаваў яе, бо ведама-ж: і ў панскай палюбоўніцы ёсьць чалавечае сэрца, і яна-ж на сваім хлебе—чалавек.

Шкадуюць людзі палячку, наракаюць на Арцёма за ганарлівую натуру.

А музыцы нашаму дадзела тое горш за рэдзькі. І сам ён шкадаваў прыгожую палячку, ды раз назлосьць усім сказаў каму-сьці гэтак „Не хачу за панам падбіраць... Няхай яна сабе другога пашукае!“

Злыя людзі вазьмі і дакажы палячцы.

От-жа вышла гісторыя, зусім, як у сьвятым пісьме аб Язэпе тым Прыгожым і начальнікавай жонцы.

Прыехаў пан, палячка з роспачы йназводзіла яму на беднага музыку.—„Так і так,—кажа,—„лез гэты хамуйла да мае красы“.

Але пан сьцяміў, што справа, мабыць, трохі іначай выглядае.

Гукнуў ён да сябе Арцёма, запёрся з ім вока на вока ў кгабінэце і ну яго пытаць:

— Скажы, хаме, чым ты прывабіў да сябе маю палячку?

Маўчыць Арцём. І што тут скажаш?

—Хочаш ты, хаме, з ёю ажаніцца?—ізноў пытаецца у яго пан.

— Нізашта ў сьвеце, найласкавейшы пане!—цьвёрда адказуе Арцём.

— Цо-ж я бэнда з вамі робіў?— як-бы раіцца з ім пан;—іграў ты ёй хамскія песьні?

— Іграў, паночку!

— То выбірай, галгане: або жаніся з ёю і садзісь на хлопскую там гаспадарку, або маеш іграць ёй што хоцькі... адну ноч?

— Жаніцца, ніколі не жанюся, а йграць— на тое мне і пальцы Пан Бог даў.

— Добжэ мувіш, хаме,—пасьміхнуўся пан;— паментай-жэ о тэм!

А за колькі дзён зьдзеялась неспадзейнае няшчасьце: захварэла палячка і памёрла...

Мабыць, паднёс атруты пан.

Прыбралі яе на той сьвет у багатыя панскія уборы, паклалі ў вялікай салі на чорны стол, запалілі сьвечкі, адно толькі забыліся—ксяндза прывесьці малітву сатварыць.

Наступіла ноч, кліча пан музыку з іскрыпкаю.

— Паменташ, хаме, цо мне мувіл?

— Помню, найласкавейшы пане.

— Ну, то йдзі іграй цэлую ночку нябожчыцы, каб яе душа ня вельмі сумавала па гэтым марным сьвеце...

Спужаўся наш музыка, думае: жартуець пан... Не!

— Ідзі, ідзі,—кажа,—галгане, такая-ж была у нас умова.

Пайшоў Арцём у салю. і зачынілі яго там аднаго з палячкаю.

Жудасьць ахапіла людзей, вялікі жаль мелі да музыкі і баяліся, што ў той салі пры нябожчыцы прыйшла-ткі на яго загуба.

Спаміналі цяпер розныя страшныя нараканы; як уставалі памершыя з труны, каб загубіць таго, каго ў жыцьці дужа любілі.

Сталі навет шаптаць, што палячка была чараўніца, старая кракаўская ведзьма, якая ўдалася прыгожай панскай палюбоўніцай, каб загубіць нашага музыку.

Казалі навет, што і сам пан Дастаеўскі спутаўся з чартамі, якім даўно карціла зьвесьці з сьвету слаўнага музыку. Вядома, чарцям няма спакою ад добрага музыкі, бо ён сваім харошым граньнем робіць людзей лепшымі, вернець іх на добрыя думкі.

А было ўсё гэта пад канец лета, калі з прыходам восені наступаець самая вядзьмацкая пара.

Што-ж тымчасам рабіў Арцём?

Прыйшоў ён да труны, пераксьціўся, памаліўся за ўмершую душу і ўзяўся настраіваць сваю старую скрыпку.

Тады адчыніў напята вакно і даў першы гук на струнах...

Як нейкі боль, як нейкі стон раздаўся гук у садзе, сярод адцьвіўшых красак, сярод агорнутых цішою ночкі дрэў, пачуўся ён у сэрцах панскай чэлядзі і даляцеў да пана, сядзеўшага у кгабінэце пры чарцы старага віна.

Усё прыслухалась: што будзе граць музыка нябожчыцы на разьвітаньне?

Памаўчаў трохі музыка і паволі, сьціха, маркотна заіграў „Вечную памяць“.

Дужэлі гукі, расьлі, і вось здавалася, што цэлы хор папоў адпявае чалавека.

Яшчэ дужэйшымі рабіліся гукі, і дзіўна было ведаць, што там усяго толькі адна скрыпка так пяе...

Ня хор папоў пяяў там, а быццам тысячы панурых галасоў зьліліся ў адным хаўтурным гімне.

Слухаючым тую песьню жаль было марнай чалавечай долі, мізэрнымі былі раскошы гэтага сьвету, нікчэмнымі нашыя сваркі й звадкі. „Суета суетъ и всяческая суета“, „Прахъ еси и прахомъ отыдеши“—пялялася ў той песьні.

Але скончыў музыка маліцца, памаўчаў трохі і зайграў штось іншае. Трудна было адразу ухапіць, аб чым гаворыць яго скрыпка, але чулася нешта знаёмае, даўна вядомае, даўна пяражытае. Як-бы там лес шуміць, як-бы завіруха ў полі гудзіць, ізноў-жа як-бы жнеі пяюць. Зайграў, значыцца, музыка аб штодзенным жыцьці чалавека. Кашаль б'ець старога дзеда, гоман які-сь людзкі, як бы сварка бабская, кугаканьне дзяцінае... І такое выразнае, дарма што скрыпка, быццам запраўды хворае ці галоднае дзіцятка заходзіцца. Так плача, так плача, што вытрываць аж трудна, хочацца бегчы да яго, каб суняць тое плаканьне. І чуецца, што сунімаець матка: „А-а, а-а, малое! а-а, а-а, беднае!“ Патрошку сьціхаець дзіця, калышаць яго матка, скрыпаюць пачопкі пераз цаўгую ночачку, скрыпаюць і скрыпаюць, як-бы вось тут во, кала цябе, дарма што гэта, адно, скрыпка даказвае пад музыкавымі пальцамі. Звычайныя песьні граў музыка, але слухаў-бы яго, слухаў без канца-краю, бо як сыграў музыка, то як-бы што-сь у сэрца налажыў.

„Ня плач, маё дзіцятка, а цыц маё родна:
Вун там войт ідзець,
На татку, на мамку ён бізун нясець,
У тым у бізуне скураты увіты,
На тым на бізуне сьлёзкі паліты“...

І шмат чаго іграў музыка аб сваёй нядолі змалку дзён.

А так, песьня за песьняй, сыйграў усё жыццё сваё.

Цёмная ноч стаяла на дварэ, а як іграў, то быццам расплывалася цямнота: то жніво перад вачмі, жнеі пяюць, то ў сенажацях косы звоняць то ў супрадках вераценцы трынкаюць, то на ігрышчы лявоніху хлопцы з дзеўкамі скачуць.

І нікому не здавалася дзіўным, што ля труны нябожчыцы іграець ён ня толькі хаўтурнае, але й штодзеннае, бо ўсё пакаралася пальцам музыкавым; усё было толькі хараша, ці яно сьвятое, ці грэшнае.

Аж так і да паўночы падыйшло.

Дайшоў музыка да тае нешчасьлівае часіны, як іграў палячцы наскія песьні.

Трубіць паляўнічы рог, гаўкаюць ганчакі, гэта значыцца, выяжджае пан на ловы.

Сьмяецца палячка, як-бы званочак сярэбраны,—гэта яна цешыцца, што Арцём да яе ідзець. Пакацілася ад скрыпкі смутная жніўная песьня гэта ён пачаў іграць ёй наскія песьні.

Песьню за песьняй іграець скрыпка, і такая жальба, такая жуда чалавечае душы была ў тым граньні, што сэрца ад болю ўсім сьціскалася, божы сьвет ня мілы робіўся, жадалася чаго-сь невядомага, чаму ніколі на сьвеце ня бываць. Разьліваецца ў сьлёзах скрыпка, плачаць аб марнасьці ўсяго сьвета, дзе адзін любіць, а другі—не. Так іграў

Але вось перабіваецца іграньне на новы тон. Выплываець напаверх магутны гук, горды, пераможны, пад якім ледзьва чуваць і тыя песьні жніўныя, і тое мучаньне палячкіна. Зайграў Арцём аб сваей гордай, адзінокай душы, зайграў аб сваёй музыцы. Грыміць няземны гімн, аж увесь сьвет ад тых гукаў дрыжыць... Панад усім вышэй стаіць музыкаў гімн, няма той сілы ў сьвеце, якая-бы яго сходала.

Раптам зарагатала з кгабінэту панскага нешта нялюдскае, дзікое... Пан рагочаць, вые, сьмяецца. А музыкаў гімн, не зважаючы, плывець шырокай хваляю ў паветры цёмнае начы, як тая магутная бурлівая рака у паводкі.

Сьціхла рагатаньне, і сярод музыкі раптоўна бух!

Сьціхла й музыка, бягуць людцы да пана ў кгабінэт, глядзяць: аж ён ляжыць з разьбітымі мазгамі, пісталет турэцкі пры ім уронены ляжыць.

Здужала яго нячыстую сілу Арцёмава іграньне: —застрэліўся наш пан!

Пахавалі яго з палячкаю разам, Арцёма болей мы ня відзелі: сыйшоў ад нас у сьвет, ня ведама куды.

Вось які быў у нас музыка, вось якое-што часам дзеялася за прыгонам.

29.VIII.1921 Максім Гарэцкі.

Хаценчыцы Вялейскага пав.

4 верасня г. г. адбылося сабраньне солтысаў гміны, якія пастанавілі прасіць п. школьнага інспэктара, каб у сёлетнім вучэбным годзе ў Хаценчыцах, Башурыне, Будзьках, Чарвякох адчыніў польскія школы, а у в. Карпавічах, Шыпках, Лоўцавічах, Сакольля-Угле польска-беларускія. „Odpis“ гэтага пастанаўленьня ўжо больш, як паўтара месяца пасланы п. інспэктару, а пра школы нічога ня чуваць. Трэба сказаць праўду, што у Хаценчыцкую польскую школу дык п. інспэктар парупіўся прыслаць вучыцеля і вучыцельку, і нат‘ ёсьць чуткі, што ў в. Шыпках і Куляшох маець адчыніць польскія школы, а беларускіх п. інспэктар не адчыняець, ня гледзячы навет на тое, што сяляне вёскі Куляшоў спачатку верасьня паслалі заяву, каб у іх вёсцы была беларуская школа.

Гэткія адносіны п. інспэктара да беларускіх школ вызываюць нездаваленьне і нараканьне на ўладу сярод тутэйшых жыхароў беларусаў, якіх ёсьць каля 80% у нашай воласьці.

I. С.

Як нас перапісавалі 1 кастрычніка.

Паважаны Рэдактар, не адмоўце, калі ласка, зьмясьціць у Вашай газэце ніжэй пісанае:

Як і ўва ўсіх вёсках Рэчы Паспалітай Польскай, 1 кастрычніка адбываўся перапіс і у нашай вёсцы Сл.., Нясвіскага павету.

Калі я прышоў у хату запісацца, то там ужо быў перапісчык, малады чалавек, які сядзеў так, што навет ня бачыў тых, каго запісаваў. З перапісчыкам быў і прадстаўнік ад сялян Г. Запісаўшы даныя аб гаспадарцы, перапісчык стаў запісаваць людзей. Пытае, колькі гадоў, жанаты ці не, праваслаўны ці каталік і больш нічога. Аб нацыянальнасці, аб роднай мове, аб адукацыі, аб званьні нічога ня пытае. Запісаў і мяне.

Ведаючы, што ў бланку павінен быць радок аб нацыянальнасьці, мове і інш., я зацікавіўся, як ён запісаў мяне і маіх родных. І што-ж Вы думаеце? Запісаў, што мы, уся сям‘я не адукаваны, што наша родная мова расейская, што ўсе мы земляробы, словам, усіх на адзін капыл.

Я яму і заўважыў, што ня правільна запісана, таму што—запісаваў не са слоў нашых, а як сам хацеў, што мова наша не расейская, а беларуская, што мы гэта добра ведаем, што мы павінны гаварыць праўду, а пан гэта запісаць.

Тады толькі гэты панок падняў вочы і як даведаўся аб маей адукацыі, то яшчэ з большаю рызыкаю (мусіць, каб навясьці мяне і усіх нас на розум!...) стаў давадзіць, што мы ня ўмеем гаварыць пабеларуску, а гаворым папросту, значыць парасейску. Ён ніяк ня мог згадзіцца са мною, што няма простай расейскай мовы, а ёсьць народная і літэратурная мова (па тэорыі славеснасьці) і што ня можна так груба зьмешываць такія простыя рэчы, што гэта будзе адно непаразуменьне, што нат каталікі-беларусы будуць запісаны, што яны гавораць парасейску, а значыць яны і расейцы, у той час як яны самі па сваей неасьвечаннасьці або навучаньню ксяндзоў - паланізатараў кажуць, што „яны польскія“, палякі. Пан не здаецца і ўсё павышае тон. Я запрапанаваў пану і запісаць нашу мову простаю, а не расейскаю Нябось пан з гэтым не згадзіўся (мусіць і ён трохі вучаны!).

Тады ён стаў злаваць, і мусіць, каб запужаць, запісаў, што я беларус расейскі падданы, у другой хаце сказаў, што мяне вышлюць у Расею.

На маё запытаньне, як яго прозьвішча і імя, ён сказаў. Гэта нехта п. Міхал Янушкевіч.

У другіх хатах ён ужо стараўся пісаць са слоў людзей, але усё-ж такі даказаваў, што яны гавораць папросту, гэта значыць парасейску. Больш сьвядомыя сяляне цьвёрда заяўлялі, што мы беларусы і родная мова наша беларуская.

Як запісаваў ён іх далей—няведама, але да гэтага вышлі досіць цікавыя рэзультаты. Добрая палавіна сялян, двароў з 80, запісана, што гавораць парасейску.

Ня усьпеў я даведацца, да якой-жа нацыянальнасьці ён нас далучаў. Калі ён пісаў, што мы беларусы або палякі, то гэта нясуразнасьць —вышлі беларусы або палякі з расейскай моваю. Калі пісаў, што ўсе мы расейцы, то з гэтым ня згодзіцца ні адзін наш селянін—каталік. Словам вышла страшэнная путаніца. Каму гэтая путаніца патрэбна, сьвядома ці не сьвядома так перапісавалася—трудна сказаць. Я склонен думаць, што гэта рабілася па несьвядомасьці, або неасьвечанасьці перапісчыка.

А урад і палітычныя колы, разумеецца, будуць апірацца на даныя гэтай перапісі, на іх вясьці той ці іншы курс палітыкі ў адносінах да нашага беларускага народу.

З пашанаю Ш.
з ваколіцы Нясьвіжа.

Вязынская воласьць Вялейскага павету.

Надыходзе зіма. Трэба было-б сабіраць дзяцей ды пачынаць заняткі ў школах, а ў нас ува ўсей воласьці блізу ўсе школьныя будынкі стаяць бяз вокан, дзьвярэй і печаў. Ніводная школа ў воласьці яшчэ не адчынена, у школьных будынках адбываюцца вечарынкі, часамі надта няпрыстойныя.

Да вайны 1914 года ў мястэчку Вязынь істнавала двухклясовая расейская школа, будынак, якой, толькі што перад вайной пастроены, добра захаваўся да гэтых часоў, і царкоўна-прыходзкая жаноцкая школа, будынак якой вельмі папсаваны ў часе вайны. Была ў мястэчку адна манаполька, у 1914 годзе закрытая; двухклясовая ж школа сяктак, з горам папалам, істнавала. Расейская, праўда, —мала ад яе карысьці было нам, беларусам, але ўсе ж такі нашы дзеткі ўзімку вучыліся, а не ганялі па вуліцы сабак, а часамі й людзей.

У гэтым годзе школы няма яшчэ ніводнай, хаця вучыцель і вучыцелька польскія ўжо прыехалі. Чаму польскія, а не беларускія, калі ўсе жыхары воласьці беларусы (і праваслаўныя) або жыды? Каталікоў надта мала, а пра палякоў, апроч п. Гіцэвіча, няма чаго й гаварыць. Дык чаму-ж гэта для нас не адкрываюць нашых беларускіх школак? Ці ў землях пад польскаю ўладай можна вучыцца ня йначай, як папольску?

Яшчэ ў летку ў мястэчку адкрыты дзьве карчмы рэстаўрацыі, каапэратыва ніводнага. Ня гледзячы на дарагоўлю гарэлкі і адсутнасьць заробкаў, п‘юць усе і ўсюдых.

У Пахомаве, дзе 14 верасьня людзі сабраліся маліцца Богу, і там было п‘яных. П‘юць жанчыны ня горш за мужчын. Дзяўчаты не адстаюць ад хлопцаў і лыкаюць чарка ў чарку. Робяцца яны тады вясёлымі, рызыкоўнымі.

Што-ж! Пійце, дзяўчаткі, гэту жывучую вадзіцу. Ніхто яе для вас не папікадуе, не балела-б толькі галоўка, ды не запэцкалася-б ваша беленькая хустачка ў хмялю. Агулам кажучы, справа патрабленьня сьпірытусу ў воласьці стаіць дужа добра, затое справа народнае асьветы,—вельмі й вельмі дрэнна. Ніхто аб гэтым ня думае, мясцовых вучыцялёў няма. Ці не пара бы гэта было нашаму пану-войту гміны і паном вясковым солтысам паклапаціцца й падумаць, заместа пляшкі, —аб рэмонце школьных будынкаў ды аб адкрыцьці школак, ня польскіх толькі, якія нам мала дадуць карысьці, а нашых тутэйшых беларускіх, якіх жадае народ, ды баіцца заікнуцца, каб ня лічылі яго „бальшавіком“ і праціўнікам улады.

Калі быў улетку запрос ад п. школьнага інспэктара, колькі школак трэба на воласьць, ці пыталіся вы, п. войце, у людзей, якіх школах яны жадаюць? Здаецца, не. Вы ўсіх, хто пытаўся ў вас аб школках, супакойвалі школкамі польскімі, бо п. школьны інспэктар сказаў, „będa szkoły tylko polskie“, і аб беларускіх ня можа быць гутаркі.

А наш народ спакойны, ня любіць пярэчыць уладзе й маўчыць, захаваўшы пры сабе свае думкі ды чакаючы „нейкіх перамен“. Каб п. школьны інспэктар быў павядомлены у свой час, што людзі ў воласьці хочуць школак беларускіх (а такіх бы нашлося шмат, калі ня ўсе вёскі) п. інспэктар школьны заместа пасылкі беларускіх вучыцялёў павету кудысьці там у Кракаў на курсы „języka polskiego“ цяпер зімою, —мабілізаваў-бы ўсе вучыцельскія сілы павету ды й паназначаў бы іх у школкі вучыць дзяцей, адкрываць курсы для узрослых, рукавадзіць моладзьдзю ў ігрышчах, у пастаноўцы сьпектакляў і культурна-прасьветных вечароў. Ніхто ня зможа гэтага для беларусаў так добра зрабіць і навучыць, як беларускі, тутэйшы вучыцель, хоць быў й ня знаючы „докладне“ языка польскага. За адзін год было бы імі многа зроблена для народнае асьветы.

Хіба-ж то ў польскіх школьных інспэктароў палітыка не дапускаць беларусу яго роднае культуры, кормячы сваёю, польскаю? Хіба іх мэтаю аставіць беларуса, нашу родную вёску такой цёмнай? Тады справа іншая, але-ж мы гэтага ня думаем, спадзяёмся больш прыязных адносін, і радзім жыхарам вёсак Вязынскай воласьці дружна ўзяцца зьбіраць подпісы, просячы п. школьнага інспэктара адкрываць школкі беларускія. За гэта вас не павесяць і ў кутузку не пасадзяць.

Вязынец.

Зьезд прадстаўнікоў каапэратываў у Лідзе.

20 кастрычніка ў м. Лідзе адбыўся зьезд прадстаўнікоў Лідзкага Саюзу Спажывецкіх Таварыстваў.

З дакладу сябры ураду п. Шаптуноўскага аб дзейнасьці Саюзу выявілася вельмі марнае становішча Саюза: хаця за час ад пачатку гэтага году да 1 кастрычніка лік таварыстваў, належачых да Саюзу, з 33 павялічыўся да 50, а агульная сума балянсу з 2.000.000 да 8.000.000, Саюз ня мог нічога даць сваім сябрам, апроч манапольных тавараў. Справаздача Ураду выклікала цэлую буру закідаў, часамі зусім няслушных, з боку прысутных на зьезде 12 кзяндзоў (з агульнага ліку 40 дэлегатаў). Закіды гэтыя, як потым высьветлілась, можна было зьвесьці да вось чаго: 1) Урад Саюзу даканаў некалькі транзакцый куплі тавараў у гандляроў не хрысьціянскай рэлігіі, 2) ня мог даставіць ўсіх патрэбных тавараў. Што датыча першага, дык нам выдаецца вельмі дзіўным падобнае становішча лідзкіх каапэратараў. Хіба гэтыя „каапэратары ў сутане“ забыліся, што каапэрацыя павінна імкнуцца да зьнясеньня ня толькі жыдоўскага гандлю, але гандлю наогул, бо і адзін і другі добра вызыскаюць спажыўца; ў „учцівы гандаль“ каапэрацыя ня верыць. Што датыча другога, дык мы зусім згаджаемся з шаноўнымі „хрысьціянскімі каапэратарамі“, аднак, мусім зьвярнуць іх увагу на тое, што на кожны каапэратыў, належачы да Саюзу, прыходзіцца толькі каля 24.000 паявога капітала (1.182.389:50)! На гэтую суму Саюз пеўна даў добрых тавараў па танных цэнах. Старому Ураду, лепей сказаць п. Шаптуноўскаму, бо толькі ён прадстаўляў увесь Урад, выразілі недаваранньне і выбар новага Ураду даручылі Радзе Надзорчай, склад якой напоўнілі новымі сябрамі. З пазьездавых размоў мне, аднак, удалось выясьніць, быццам недаваранньне п. Ш. была выражана не за мала энэргічнае кіраўніцтва Саюзам, але за прыналежнасьць да пеўнай соцыялістычнай партыі. На першы пагляд гэта выдаецца дзіўным, аднак, калі зважыць лік „каапэратараў у сутанах“, іх проста дэмагагічныя манеры, дык, хто ведае, можа гэта і праўда. Саюз, як аб гэтым дакладаў сябра Ураду п. Петржак, быў сарганізаваў каапэратыўныя курсы, якія скончыла 14 камандыраваных таварыствамі і 24 здэмабілізованых жаўнераў. Сярод іншых ухвал зьезду мусім адзначыць адну, каторая датыча павялічэньня паёў у каапэратывах, а праз гэта і ў Саюзе. Шчыра вітаючы гэтую ухвалу, павінны сказаць, што усё гэта прынясе для Саюзу толькі часьцічнае падтрыманьне; найлепшай, аднак, радай мы лічым злучэньне з іншымі каапэратыўнымі арганізацыямі края ў адну вялікую моцную арганізацыю, як аб гэтым гавораць ухвалы між-саюзнай канфэрэнцыі.

На другі дзень адбылось паседжаньне Рады, на каторым выбралі новы Урад, ў склад якога ўвайшлі: п. Беднаровіч, б. сябра Ураду Менскага Саюзу і кіраўнік аддзелу Віленскага Саюзу ў Багданаве, п. Петржак б. сябра Рады Менскага Са-

ДЭКЛЯМАТАР*).

Янка Купала.

Гэй, наперад!

Гэй, наперад, покі сэрца
  Б‘ецца, рвецца на прастор,
Годзе млецi ў паняверцы;
  Гэй, да сонца! гэй, да зор!
Хай бацькі стагналі ўчора,
  Йшлі на той сьвет без пары;
Сёньня ў нашай моцы гора,
  Мы жыцьця гаспадары!
Думка ў думку, дружна, сьмела
  Усе наперад грамадой!
Кожны ведай сваё дзела,
  Знай, за праўду крэпка стой!
К новай долі шлях нам ляжа,
  Як на небе млечны шлях,
Слова, дум, ніхто ня зьвяжа;
  Жыць, цярпець ня будзе страх!
І ня стане больш пакуса
  Першых-лепшых збоку браць
Славяніна-беларуса
  Вечна ў лапці абуваць.
Дык наперад, покі сэрца
  Б‘ецца, рвецца на прастор!
Годзе млецi ў паняверцы!
  Гэй, да сонца! гэй, да зор!

Якуб Колас.

* * *

Мы ходзім—спатыкаемся,
Бадзяемся, як п‘яныя;
Мы з голадам зрадніліся,
Худыя, абарваныя.
    Асьмеяны, абляяны,
    Гразёю мы абмазаны,
    Багатымі мы скрыўджаны,
    Няволяю мы зьвязаны.
У балоты мы адціснуты,
Загнаны мы у шчыліны;
І вочы нам завязаны,
І вушы нам зачынены.
    Адно мы добра ведаем:
    Хоць вечна мы блукаемся,
    А ўсё-ж такі, хоць некалі,
    А праўды дапытаемся.

*) Гл. № 8.

Пётра Просты.

АБРАЗКІ.

(Ахвяруецца Якубу Коласу).

Я чуў, як мой брат-беларус сьпяваў свае песьні.

Божа! Колькі мукі і енкаў у яговым голасе, колькі скаргі страшнай у гэтай песьні, што выходзіла з яго грудзей і смутна і нудна лілася па полі, аддавалася гулка ў лесе і падымалася вышэй і вышэй—аж да сіняга неба!

За сэрца хапала гэтая песьня—песьня мужыка-нявольніка.

Загудзелі ў душы ўсе струны, з грудзей вырваўся енк і на вачах закруціліся сьлёзы...

Бедны, бяздольны народ; сьлязьмі і потам залітая зямелька.

* * *

Вот вёска, дзе жывуць мае браты.

Дрэньненькія хацёнкі прыляпіліся адна да аднэй; абапал стаяць хлявы і паветкі; дзе-ня-дзе ўгледзіш садок. Толькі рабіна, што плача чырвонымі сьлязьмі, ды кудравая бяроза, ды хвойка векавечны глядзяць на тваю, беларус, нядолю...

Як смутна!..

А кругом раскінулася шырокае поле. Як мурашкі, высыпаліся туды мужычкі і, сагнуўшыся над цяжкімі сохамі, аруць усохшую зямельку. Тут уся іх надзея, усё іх багацьце, усё іх шчасьце...

* * *

У беднай, курнай хатцы, на канцы вёскі, гарыць лучына, уткнёная ў сьцяну. На скрыпучай жэрдцы вісіць калыска, а ў ёй ляжыць галоднае дзіцятка. Над ім, сагнуўшыся, стаіць маці і пяе песьню—нудную, смутную песьню, а ў тэй песьні столькі енкаў, столькі нявыплаканых сьлёзаў, што самому хочацца разам з ёю плакаць і крычаць на ўвесь сьвет: „Ратунку! Падмогі!..“

А там, у куце, на лаве варушыцца нешта пад кажухом. Гэта хворы мужык-гаспадар хоча падняцца, каб напіцца вады—і ня можа. Яго кінулі сілы: цяжкая непамерная праца падтачыла яго здароўе, і вось ён ляжыць, бядак, зьвесіўшы мазалістую руку, і сьпёкшыміся губамі шэпча: „Піць“, а пасьля доўга-доўга кашляе... Відаць, што ўжо апошнія свае дні дажывае мужык. Гэта канец гаротнага жыцьця...

* * *

Вот могільнік, гдзе ляжаць косьці нашых дзядоў і бацькоў.

Некалькі хвоек, ліп і бярозак, з паўсотні згніўшых крыжоў—і ўсё...

Як ціха, як смутна.

Ніщто не парушае вечнага сну нябожчыкаў,—іх адпачынку па цяжкім, бяздольным жыцьцю. Толькі часам закрычыць сава, што зьвіла сабе тут гняздо ў дупле старой ліпы, закаркае варона, закукуе-загалосіць зязюлька над мужыцкай нядоляй. Заўтуруюць ёй сваім шумам хвойкі і бярозы—і ізноў усё сьціхне, засьне...

Вось ты які, мой родны край!

Смутак вее ад тваіх вёсак, ад палёў тваіх і лясоў, ад рэк і вазёраў, і ад тых крыжоў, што стаяць пры дарогах. Смутак чуваць у тваіх песьнях-скаргах, мужык беларускі; смутак і надзея ў тваіх малітвах, што да Бога шлеш.

Смутак і скарга...

Люблю цябе, мая родная старонка, мая матка—Беларусь! Ты выгадавала мяне, ты мне паказала нядолю і сьлёзы маіх братоў.

. . . .

Віджу—ўсходзяць над табой зоркі ясныя. Усё сьвятлей робіцца ў табе...

Веру—ўстане сонца, пашле яно нам свой сьвет, разгоніць туман, што спавіў цябе, Беларусь!

Прыйдуць для цябе лепшыя часы...

Для сыноў тваіх зачнецца новае жыцьцё—вольнае, сьветлае! Стануць яны ўрад са старэйшымі сваімі братамі і дружна возьмуцца да агульнай працы, а ты, маці, падымеш спаняверанную дагэтуль галаву і сьмела будзеш паглядаць у ясную будучыну, што нясе тваім дзяцём лепшую долю, лепшую славу!

Язэп Беларус.

Да Беларусі.

Беларусь, ты не загінеш,
Беларусь, ты не памрэш!
Волі—долі не пакінеш,
Варагоў перамажэш.
    Беларусь, ты маеш многа
Сёл, мястэчак, гарадоў,
І дадуць яны даволі
За свабоду ваякоў.
    З імі крыж свой цяжкі здымеш
Той нядолі, што нясеш,—
Беларусь, ты не загінеш,
Беларусь, ты не памрэш!

Альгерд Абуховіч.

Ваукалак.

Чараўніца уракла,—
Быў я колісь ваўкалакам:
Бегаў чортам ўздоўж сяла,
І к гавядам поўзаў ракам,
І людзкую знаў гаворку,
І з сабакамі знадворку
Гаварыць я спосаб меў,
За гумном раз ціха сеў,—
Ажно лыска прыляцеў.
Як на панскай службе стаў,
Па прыязьні ён мне кажа:
—«Кінь ты, куме, жыцьце ўража:
«Цяпер марна прападаеш,
«А ты-ж—ўсякі спосаб знаеш:
«Майму пану стань служыць,
«Табе добра будзе жыць»
—«Ах ты, дурню, думаў я:—
«Мне вярнуцца да сяла?
«З сваім панам і с сялом
«Задушыся ты калом!
«Хоць галодзен—я свабодзен,
«Гдзе мне цягне—там бягу,—
«На свабодзе прападу,
«А ў няволю—не пайду!
«Буду вольным ваўкалакам,—
«Ты-ж—на прывязі сабакам.

Альгерд Абуховіч.

Старшына.

Хоць які кірунак дай,
Адно тое, братка, знай,
Што крутнёю ўсё пакруціш,
І найлепша збаламуціш.

Льва—манарха воўк прасіў,
Каб вайтом яго зрабіў, —
Бо авечкі у нялядзе
Шкодзяць вельмі ў панскім садзе,
Ды і самі прападаюць,
Бо як жыці бач ня знаюць.
І ліса за ім прасіла
(Яе жонка льва любіла).
Воўк з лісіцаю звязаўся
І як можна так стараўся:
— Дзе прасілі, дзе ўздыхнулі,
Дзе гасьцінца падаткнулі:
Каб дабіцца да мэдалі
І плацілі, і прасілі, і стагналі...
Леў гаворыць: „Ходзяць толкі,
Што авец зьядаюць воўкі.“
І сазваць сказаў народ
На зьвярыны вальны сход,
Распытаць усіх зьвярат:
— Воўк ці добры, ці ён гад?
Чыны важны ўсе прышлі,
Усё начальства тут было,
Ды прычыны не знайшлі,
Зла аб воўку ня чутно:
Пад судом ён бач ня быў,
І з начальствам добра жыў,
Дык мэдаль вайта надзеў
Воўк на ўвесь авечы хлеў.
— А авечкі што-ж сказалі?
— Іх на сход зусім ня звалі,
А сьпісана ў пратаколе,
Што „авечкам дана воля“.

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце яе на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзець больш падпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісывацца, бо ад гэтага залежаць далейшае жыцьцё „Беларускіх Ведамасьцей". Хто ня умее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і соцыяльных ворагаў і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Годзе нам спаць, годзе нам быць самым адсталым народам. Браты, прыміце блізка да сэрца усе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб „Беларускія Ведамасьці" у вашым раёне выпісываліся і пашыраліся. Хай жывець народная справа!

юзу і нспэктар вайсковых каапэратываў 2 арміі яшчэ адзін з мяйсцовых прадстаўнікоў.

Новы Урад мае да 15 лістапада прыняць Саюз і пачаць працу.

Жычучы новаму Ураду памыснай і карыснай працы, радзім яму ў сваю праграму уключыць гэтакія пункты:

1) хутчэйшае злучэньне з іншымі Саюзамі ў адзін агульна-краёвы

2) энэргічная прапа ў усьведамленьні кіруючых каапэратывамі асоб і спажыўцоў.

Каапэратар-селянін.

Аб сойме у Вільні.

Гэтымі днямі мае выйці дэкрет Начальніка Сярэдняй Літвы ген. Жэлігоўскага аб тым, што будуць выбары ў сойм Сярэдняе Літвы, якія назначаюцца на 11 сьнежня (дзекабра) г. г.

Надоячы старшыня акружнай выбарнай камісіі граф Грабоўскі быў у старшыні Віленскага Жыдоўскага Кагалу д-ра Выгодзкага і ў сэкрэтара Беларускага Нацыянальнага Камітэту грам. М. Кахановіча з просьбаю даць у выбарныя камісіі прадстаўнікоў ад жыдоў і ад беларусаў.

Д-р Выгодзкі адказаў гр. Грабоўскаму, што жыды дадуць свой адказ цераз 2—3 дні, спачатку парaіўшыся, ісьці ім на выбары ці не, а яшчэ дабавіў, што па дайшоўшых да яго вестках жыдоўскае насяленьне ад выбараў, мабыць, адмовіцца.

Гр. Кахановіч адказаў гр. Грабоўскаму, што пытаньне аб кандыдатах у камісіі па выбарах у сойм знаходзіцца ў залежнасьці ад таго, ці пойдзе Нацыян. Камітэт і тыя, каго ён прадстаўляе, на выбары. Дзеля таго, што Нац. Камітэт гэтай справы яшчэ не падымаў, немагчыма адказаць і на пытаньне аб кандыдатах.

Гэтымі днямі адбыліся нарады правадыроў беларускіх партый і арганізацый і зьявіўся артыкул у газэце „Кrупіса", пасьля чаго высьнілася, што й беларусы, трэба спадзявацца, таксама на выбары ня пойдуць.

„Кrупіса" піщаць: „Жыды у Віленскі Сойм ня вераць ані трохі, і наскольні можна цяпер судзіць, яны да выбараў ня пойдуць. Думаюць так затым, што ў цяперашнім часе ў нас цалком запанаваалі эндэкі (палітыкі, што за паноў стаяць) і дзеля гэтага немагчыма тая свабода, якая абавязкова патрэбна падчас выбараў і якой кожны народ мае права дамагацца. Выбары-ж бяз Жыдоў выглядалі-б нейкія куртатыя, бо Жыдоў у нас, асабліва-ж у Вільні, дужа шмат і, калі склікаць такую важную рэч, як сойм, дык іх абмінуць ніяк нельга, як нельга гэтага зрабіць і з ніякім народам.

Што датычыць Літоўцаў, дык і гаварыць нечага, што яны ды гэтых выбараў ня пойдуць; зробяць яны гэта прадусім дзеля таго, што яны усе жадаюць бідзець край наш незалежнай дзяржавай, а каб склікаць сойм да Вільні у цяперашнім часе, дык аб гэтай незалежнасьці ня было-б і мовы, бо тады было-б зроблена тое, чаго пажадалі-б эндэкі і іхныя панскія брахуны „крэсовыя стражнікі". Апрача таго, трудна таксама Літоўцаў завярнуць у ваглоблі Сойму, маючы на воку ўсё тое безгалоўе, якое яны апошнім часам пераняслі ад Ураду Сярэдняй Літвы. Гэтая Улада літоўскіх гімназістаў выгнала з будынку і будынак забрала пад польскую гімназію, выкінула з прытулку літоўскіх дзяцей, бо патрэбны быў будынак, закрыла літоўскі банк, літоўскую каапэратыву; а пры гэтым, як пісала закрытая літоўская газэта „Vilnius", а нат і польская „Gaz. Kr." не абышлося бяз дужа і дужа прыкрых здарэньняў. Словам, зусім ясна, што Літоўцы будуць проціў Сойму. Аднак, кожны разумны чалавек згодзіцца з тым, што выбары у Сойм з Віленшчыны і Вільні, з Бацькаўшчыны Літоўцаў, так як Беларусаў і Палякоў, выбары бяз Літоўцаў, не дацуць ніякай карысьці, бо будуць несправядлівы.

А калі зойдзе гутарка аб нас, Беларусах, што ж мы будзем рабіць падчас выбараў у Віленскі Сойм, як мы будзем трымацца, дык адказ сам напрашаваецца, што і мы да гэных выбараў ня пойдзем. Мы, Беларусы, да выбараў ня пойдзем, бо наўсьці ня можам і ня маем права. Пры сучасных варунках вольныя выбары немагчымы, дык немагчыма і вырашэньне правільнае і справядлівае лёсу нашай роднай Віленшчыны. Выбары маюць адбыцца з часткі штучна выразанай з усяго краю. Дзеля гэтага нам самым прыкладаць руку да таго, каб нас кроілі, ня то што не выпадае, але было-б нягодна. Апошнім часам Беларусы дужа настрашаны і стэрорызаваны. Не гаворачы ўжо аб розных зьдзеках над сялянамі з боку польскіх жаўнераў, бо гэта ў войску кожным здараецца, наш селянін церпіць яшчэ большы зьдзек з боку польскай адміністрацыі: школаў большасьць закрыты, высыланьне беларускіх вучыцялёў у Кракаў, прымушаньне іх беларускіх дзяцей і ў беларускай школе вучыць папольску, перайманьне і нішчаньне на почтах беларускай газэты, арганізаваньне гміны так, як жадаюць паны, маючыя на мэце выключна польскія інтарэсы, а то і асабістыя, забраньне земляў чыста беларускіх, беларускіх бяз ніякіх спрэчак палякаал паводле Рыскага міра з бальшавікамі, прылучэньне іх бяз ніякіх аўтаноміяў і гаспадарка на іх, як на землях выключна польскіх... усё гэта красачкі, якія зрабілі беларуса бясконца асьцярожным да тэй палітычнай работы, якую вядуць, ці якую думаюць весьці на нашых, у многіх мясцох супольных землях, адны толькі палякі. Пекны польскі кліч: „як вольныя з вольнымі і роўныя з роўнымі" даўно ўжо паліняў, аблез і абярнуўся ў зусім іншы: „як сільныя са слабымі". Дык ясна, што як доўга адносіны Палякоў да Беларусаў ня зьменяцца самым аснаўным спосабам, патуль польскай палітычнай дзеяльнасьці ні адзін праўдзівы і шчыры Беларус не падтрымае, што знача, па нашаму прakананьню, Беларусы ад выбараў устрымаюцца.

Праўда, ёсьць тут у Вільні адзін ягомасьць, родам беларус, якога Палякі на ўсякі выпадак купілі. Гэтым ягомасьцям ёсьць вядомы з найгоршага боку Аляксюк, прадаўца беларускай справы і здраднік Беларускага сялянскага працоўнага люду, у справах выбараў ня зробіць нічога, бо гэты люд аб ім ведае даволі і яго ад сябе прагоніць проч. Словам, аб гэтым ягомасьцю няма што гаварыць і Палякі (разумеецца, паны-эндэкі) мыляюцца, калі на яго рахуюць і саўсім бескарысна кідаюць на яго свае маркі.

І так, зьбіраецца Сойм з адных палякоў, самі яны яго склічуць і самі сябе выбіраць будуць.

Голас такога Сойму будзе голасам крычачага на пустыні. Сам у сабе ён ня будзе мець ніякай вартасьці, і Ліга Народаў прызнаць яго не адважыцца.

Толькі гэта пакуль што можна сказаць аб Сойме ў Вільні."

Так піша „Кrупіса"—газэта беларускай хрысьціянскай дэмакратыі (каталікоў), орган той часьці беларускага народу, якая павінна, здавалася-б, прыхільней за ўсіх іншых беларусаў стаяць да польскай справы ў нашым краі...

Нам астаецца толькі далучыць і свой голас да сказанага „Крыніцаю".

ХРОНІКА.

— Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прыслаўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

— ГРАМАДЗЯНЕ!

Педагогічная Рада 1-ае Віленскае Беларускае Гімназіі пачала арганізаваць папулярную і навуковую бібліатэку для сваіх вучняў. Да апошняга часу справа гэта стаяла так: кніг было мала, а падручнікаў і навуковых кніг было яшчэ менш. Цяпер Педагогічная Рада хоча папоўніць гімназіяльную бібліатэку кнігамі і падручнікамі па ўсім краінам знацьця, каб даць дзяцём вельмі незаможных, бедных бацькоў магчымасьць карыстацца патрэбнымі навуковымі падмогамі.

Грамадзяне, ахвяруйце грошы, прыносьце і прысылайце кнігі. Кожная новая кніга зьменшыць сучасную, нячуваную дагэтуль патрэбу ў навуковых падмогах, пашырыць беларускую асьвету.

Ахвяры грашмі і кніжкамі на усіх мовах прыймаюцца што дзень у час лекцый (9-2 г.) ў будынку гімназіі—Вострабрамская 9, загадчыкам бібліатэкі, вучыцелем М. Красінскім.

М. К.

— Астатні № „Кrупісу" зьмяшчае цікаўнае „пісьмо ў рэдакцыю", якое тут падаём:

Паважаны Рэдактар!

Номер 24-ты прапаў бяз весьці, а з 25-ым вышла вун што: прыходжу я 18-го жніўня на почту ў Дарэчыне, аж мой номер „Кrупісу" ляжыць на стале. Я гэта кажу да пачтовага начальніка, каб аддаў маю газэту, а ён кажа: „Ня можна даць"

— Як ня можна? Чаму?—пытаюся я.

— Ня можна, бо ёсьць такі загад ад Ваяводы з Наваградка.

— Пакажыце,—кажу,—той загад.

— У тым-то і штука, што загад сакрэтны (поуфны), дык казаць ня можна,—гавора мне начальнік.—Прыказана, каб намяры задзержаваць ды адсылаць да пана Старасты ў Слонім.

— А ці жыдоўскія газэты забаронена выпісаваць?

— Не, жыдоўскія можна, а „Кrупісу" ня можна.

— Чаму?

Тут ужо начальнік не хацеў далей са мною спрачацца, на гэты раз аддаў „Кrупісu", але дальш аддаваць не абяцаўся. З гэтага ясна, што беларускія газэты ураду не падабаюцца. Але чаму прысылаюць для почтаў прыказы патайныя, чаму не забароняць публічна? Тут, відзіце, такая перашкода: у польскіх законах пазваляецца выпісаваць газэты усялякія: якія можна друкаваць, такія можна і выпісаваць. Значыць, калі „Кrупісu" пазваляюць друкаваць у Вільні, дык я, заплаціўшы грошы, маю права яе даставаць, і аніякі пан ня можа ад мяне гэтага права адабраць; ані навет пан ваявода (губэрнатар), бо законы пішуцца і для ваяводаў. Але усюды ёсьць дзьверы і фортачкі, дык і тут фортачка знайшлася. Чаго ня можна было зрабіць публічна, тое робіцца тайком, пад сакрэтам, гэта значыць,—з-за плоту. Але я хачу, каб мне паказалі закон. Чаму ня можна? На гэты раз я ня буду скаржыць да Варшавы, аднак, калі-б Ясьне вяльможнаму Пану Ваяводзе у Наваградку трапіў гэты нумар „Кrувіцы" у рукі, а ён чытаў-бы гэта маё пісьмо, дык я яму нізка кланяюсь і прашу, каб даў у Дарэчын забарон на свой патайны прыказ, каб-дыкі я мог чытаць газэту „Кrупісu", за каторую я заплаціў грошы. На гэта я маю яшчэ вось якія прычыны.

1. Да мяне даходзіць толькі адзін нумер „Кrупісу" і дзеля гэтага ён далека не расходзіцца і вялікай „шкоды" зрабіць ня можа нікому.

2. Я сам жыву у глухой вёсцу, далёка ад Слоніма і Дарэчына і аніякай палітыкай не займаюся.

3. Апроч таго, да мяне прысылаюць гвалтам з Гродны польскую газэту „Новэ Жыцe", аб каторую я ані прасіў, ані дзякаваў.

Дык няма аніякай прычыны забараняць патайнымі прыказамі, каб да мяне ня мог прыйсьці навет адзін нумер „Кrупісу"; гэта сапраўды ня пекна, ані палітычна—гэта крыўда. Калі не забараняюць прысылаць па почце газэты жыдоўскія і расейскія, дык, значыць, можна выпісаваць і беларускія газэты, у „простай" мове. Хто ня хоча, той няхай ня чытае, а вот мне падабаецца беларуская „простая" мова, дык што там такое?

Будзьце здаровы, Паважаны Рэдактар: пасылайце мне „Кrупісu" акуратна, а я ўжо тут буду шукаць права проці сілы.

Ксёндз Язэп Гармановіч.

17. X. 21. Луконіца Слонімскага павету.

— Другое падобнае пісьмо прыйшло ў „Кrупісu" ад сялян з в. Адамчукі Лаварышскай парахвіі, Віленскага павету, дзе жывуць выключна беларусы-каталікі. Адтуль пішуць так:

Паважаны Рэдактар!

Апошнім часам вельмі у нас адчуваецца адсутнасьць „Кrупіčкі". Вы шліцё яе праз почту, а мы яе зусім не атрымліваем. Мы астаёмся без сваей дарагой адзінай газэты. А чытачоў, трэба знаць, у нас нямала, бо яе кожны ахвотна чытае: і стары, і малы, а нат' бабы і тыя чытаюць, каб што-колечы даведаўшыся аб Беларусі, з суседнімі бабамі павадзіцца за Беларусь. Толькі дзякуючы сваей „Кrупісу", у нас свядомасьць шырыцца з кожным днём.

Цяпер папросім шаноўнага Рэдактара, каб нам як можна больш нумароў слалі нашай сялянскай газэткі і каб слалі заказной пасылкай. А мы са свайго боку паможам, хто сколькі могучы, складкай сваей цяжка запрацаванай капейкай

20. X. 21. Адамчуцкія Беларусы.

— У Белар. Кам. Помачы Пацярпеўшым ад вайны маець хутка наступіць новая запісь сяброў. На апошнім паседжаньні Камітэт прыняў у лік сяброў грамадзян: Рака-Міхайлоўскага і праф. Красоўскага. Гэтыя два сябры і старшыня Камітэту Кс. Ад. Станкевіч складаюць грашавую сэкцыю.

— Апошнім часам віленскім веларусам удалося навязаць зносіны з Беларускім камітэтам у Амерыцы. Зносіны гэтыя дужа памысны, бо Камітэт гэны ўжо пачынае нам пакрысе падсылаць даляры. Зносіны з Амер. Кам. завязавае сэкцыя Бел. Кам. Помачы ў Вільні.

— Пры Беларускай Гімназіі ёсьць інтэрнат для беларускіх вучняў, дзе яны дарма маюць кватэру і дарма ім вараць ежу. Прадукты вучні мусяць прывозіць самі. Бліжэй даведацца аб варунках можна у загадчыцы прытулку п. Серафімы Кішко, або ў яе памоцніцы п. М. Шутавічанкі. (Вострабрамская 9).

— У в. Сарокі Арлянскае воласьці, Лідзкага павету, дзе жывуць выключна беларусы, у гэтым годзе беларуская школа зачынена, а замест яе лідзкі школьны інспэктар п. Вус стараецца адчыніць польскую.

— У в. Займішча Курылавіцкае воласьці, Слонімскага павета, 6-га кастрычніка бандыты забілі селяніна гэтай воласьці Максіма Пятку, адабраўшы многа амерыканскіх даляраў. Жонку яго парэзалі касою.

— У в. Вольгаўцы Жалудоцкае гміны, Лідзкага павету, дзе жывуць толькі беларусы (праваслаўныя), школьны інспэктар п. Вус прыслаў польскую вучыцельку, але сяляне яе не прынялі, жадаючы беларускай школы.

— Валасная рада Арлянскай воласьці, Лідзкага павету, выбрала войтам гэтае воласьці сьвядомага селяніна-беларуса з в. Прэціма, настаўніка Янку Дразда, але павятовы староста не зацьвердзіў выбараў.

Да студэнтаў-беларусаў.

У пачаўшымся акадэміцкім годзе, як гавораць, на ўсе аддзелы Віленскага Унівэрсытэту прынята каля 40 студэнтаў-беларусаў, што з даўнейшымі дасьць да 60 чалавек. Аднак, дагэтуль яшчэ няма беларускай студэнцкай арганізацыі. Патрэбу гэтакай арганізацыі кожны студэнт павінен добра разумець. Ня хочучы даваць якіх-небудзь гатовых рэцэптаў арганізацыі, прапаную ўсім студэнтам беларусам прыступіць да арганізацыйнай працы.

Студэнты-беларусы, арганізуйцеся!

Студэнт-беларус.

— Вышлі з друку новыя кнігі: зборнікі „Беларускіх Ведамасьцей" № 1 (80 стр.), № 2 (16 стр.) і № 3 (16 стр.), якія можна дастаць у Віленскай Беларускай Кнігарні, Завальная 7, а таксама ў канторы газэты.

— Вышла з друку і прадаецца новая кніга: „Сцэнічныя творы" Л. Родзевіча. Тэатральным працаўнікам радзім дастаць яе для пастановак на сцэне.

Пісьмо ў рэдакцыю.

У артыкуле „Важны фронт" за грамадзкую работу вінаваціцца наша сялянства але па праўдзе сказаць, то наша сялянства яшчэ ня можа быць крэпкім і арганізаваным бяз помачы ад народнікаў. Вось я і хачу сказаць аб нашым сялянстве Вязынскай воласьці. У нас тут ня пытаюцца, як і што рабіць, а робіць тут тутэйшы пан Гічэвіч, як сам хочаць. Войтам у нас таксама тутэйшы грамадзянін, каторы прадаець усё сялянства за адно панскае слова. Ад каго ён выбран і дагэтуль невядома, хаця яго сялянства даўно хацела-б спыніць. А што надта крыўдна, то гэта вось што: адчыніў ён сваю цэнзуру. І калі пападзецца якая беларуская газэта, то ён і тую стараецца прагледзіць каб ня было чаго на паноў. І вось ён і задзержыў № 3 „Беларускіх Ведамасьцей" з творамі Паўлюка Бахрыма. Насілу я папаў адну. Далей — гмінных рад мы і ў вочы ня відзелі і ня ведалі, пакуль толькі ў газэтах не пачулі, што яны павінны быць. І ніводнага селяніна ня пыталіся. А для закону, калі можа і ёсьць, то пеўна якісь гэткі, як войт ці Гічэвіч. Пакуль будзе гэтая крыўда? Пакуль будзе гэтае насьмяханьне? Памажыце нам з цэнтру.

Падпісчык № 86.

Паштовая скрынка.

Л. Д.—Варшава. Калі-ж прышліцё „Гутарку старога дзеда"?

Я. Бубневічу. Так і ёсьць: ніводнае пісьмо з шасьцёх, пасланых Вамі, да нас ня трапіла.

Я. М—му. Нагвалт патрэбны закардонныя газэты. Заплоцім вялікія грошы.

І. М. У Вашай карэспандэнцыі не напісана, дзе (у якой вёсцы), калі і хто з перапісчыкаў казаў, што „беларусы за Дзьвіною, а тут толькі—палякі". Бяз гэтага карэспандэнцыя траціць вагу. Чакаем, што ўсё напішаце па магчымасьці акуратна. Калі баіцёся пасылаць з поштаю, прышліце з аказіяй. Падобныя карэспандэнцыі маюць характар дакумэнтаў, і пісаць іх павінен кожны сумленны грамадзянін, а тым болей сьвядомы беларус.

Селяніну Сіняўскае воласьці. Ахвотна выдрукуем Вашу цікаўную карэспандэнцыю аб злачынствах пісара, але спачатку, покуль ня знаем Вас асабіста, прышліце для ведама рэдакцыі свой адрэс і подпіс, пасьведчаны хоць адным сябром якой-небудзь беларускай арганізацыі.

„Бяз прозьвішча". Пашкадуйце рэдактара і складальнікаў,—пішыце чарнілам і хоць раз прачытывайце напісанае. Карэспандэнцыі Вашы дужа цікаўны і важны, але церпяць ад „агульнасьці" ў тоне; у даным прыпадку дасканальны пратакол маець большую цану, бо ў ім ёсьць факты і назовы, чаго ў Вашай прыгожай карэспандэнцыі аб перапісі часам дужа мала. Лік высыланых Вам экзэмпляраў газэты павялічым.

АПОШНІЯ НАВІНЫ

— Рада паслоў уручыла нямецкаму паслу ў Парыжы ноту, ў якой ускладае на нямецкі ўрад адказнасьць за магучае быць у Верхняй Сьлезіі нямецкае паўстаньне.

— З Будапэшта паведамляюць, што Карла й яго жонка Зіта ўзяты на ангельскі карабель і вывезены з Угоршчыны.

— У Львове паліцыя знайшла й арыштавала камуністычны зьезд.

— На Украіне выбухнула вялікае паўстаньне супроць маскоўцаў.

— Нямецкія газэты пішуць аб тым, што мае быць вайна бальшавікоў з Польшчаю.

— Урад Літоўскай рэспублікі мае цяпер 60 міліёнаў марак золатам і мяркуе завесьці ўласную валюту, курс якой будзе стаяць надта высока.

— Савецкая Расея запрошана на Вашынгтонскую канфэрэнцыю.

— Патрыярх Ціхон назначыў праваслаўным экзархам Польшчы Георгія, б. архіяпіскапа Менскага, родам украінца, надта прыхільнага да беларускай справы.

Курс на грошы ў Вільні.

6 лістапада 1921 г.

	мар.
Осты (1000)	18
Даляры	2850
Золата рублі (10)	13000

Рэдактар і Выдавец Максім Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК", Субач 2.